

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №7
Сакавік 2020

# Са святам 8 Сакавіка!







**Жанчына**

Добрая. Маўклівая. Самотная.
Мяккая. Прывабная. Душэўная.
Шчырая. Жаданая. Салодкая.
Чулая. Таемна-задуменная.

Смелая. Суровая. Рашучая.
Упартая. Упэўненая. Спрытная.
Гордая. Гарачая. Калючая.
Любая. Чароўна-аксамітная.

Сотні слоў сплятуцца ў адзінае,
Не любіць якое немагчыма.
Хай ляціць да зораў жураўлінае,
Слова непаўторнае “жанчына”.

Дбайная. Руплівая. Нястомная.
Клапатлівая. Жывая. Шчодрая.
Злосная. Кіпучая. Нязломная.
Гнеўная. Бурклівая. Халодная.

Звонкая. Прыветная. Забаўная.
Яркая. Гарэзлівая. Мілая.
Весялуха. Прыгажуня. Слаўная.
Мудрая. Каханая. Шчаслівая.

Таццяна Цвірка

## *Дарагія жанчыны!*

Сардэчна віншуем вас з Днём жанчын. 8 Сакавіка - адно з самых выдатных свят, бо яно напоўнена цёплымі словамі, шчырымі ўсмешкамі і вясновым настроем.

Менавіта вы, дарагія жанчыны, увасабляеце сабой прыродную прыгажосць, каханне і пяшчоту. Мы ўдзячныя вам за мудрасць і клопат у выхаванні дзяцей, за энергічнасць і працавітасць, за ўменне ствараць утульнасць, парадак і гармонію ў доме. Няхай у вас будзе як мага менш трывог і засмучэнняў, а шчасце і ўдача спадарожнічаюць вам заўсёды.

Рэдкалегія

# Віншавальная праграма
## “Дарагія матулі! Сонца вам, пяшчоты і любові!”

Менавіта пад такой назвай 6 сакавіка ва ўстанове адбыліся святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму дню жанчын.

Вучні падрыхтавалі для сваіх любых матуль вельмі цікавыя нумары: чыталі вершы, спявалі песні.


Епіфанаў Г., вучань 9 класа


Саўчук А., вучаніца 8 класа


Даўгаполаў А., вучань 7 класа

Удзельнікамі віншавальнай праграммы сталі самыя актыўныя матулі і іх дзеці: Барысевіч А.А. з сынам Багданам і дачкой Варварай, Гурло Ж.В. з сынам Вячаславам, Шацко Я.В. з сынам Цімафеем, Даўгаполава Г.А. з сынам Аляксандрам. Іх чакалі конкурсы і віктарыны, у якіх яны праявілі сваю кемлівасць, хуткасць рэакцыі і нават кулінарныя здольнасці.

Дзякуй арганізатарам і ўсім удзельнікам віншавальнай праграмы за добразычлівую святочную атмасферу і выдатны настрой.







# 15 сакавіка – Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь




Штогод 15 сакавіка адзначаецца Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя з'яўляецца асноўным законам нашай дзяржавы, на яе аснове фарміруецца ўся сістэма заканадаўства, у ёй вызначаецца кампетэнцыя дзяржаўных органаў.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была зацверджана 15 сакавіка 1994 года на 13-ай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання і з'яўляецца першай у гісторыі суверэннай дзяржавы і пятай па ліку Канстытуцыяй Беларусі, прынятай пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Канстытуцыя дзейнічае са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 года і 17 кастрычніка 2004 года.

16 сакавіка ў школе традыцыйна прайшло ўручэнне падарачага выдання вучням, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту. Выданне «Я - грамадзянін Рэспублікі Беларусь» ўяўляе сабой камплект, які складаецца з маляўніча ілюстраванай кнігі і двух CD-дыскаў і змяшчае максімальна поўную інфармацыю аб структуры дзяржавы, пра яе асноўны закон, Канстытуцыю, і найважнейшых галінах грамадскага і культурнага жыцця Беларусі.

На мерапрыемстве прысутнічаў старшыня Фаніпальскага сельскага выканаўчага камітэта Лобач Уладзімір Іосіфавіч, які павіншаваў юных грамадзян з гэтай значнай падзеяй у іх жыцці, пажадаў быць годнымі гэтага высокага звання і ўручыў вучням падарачныя камплекты.





Вучні 8 класа, якія атрымалі падарунак, адзначылі, што кніга «Я - грамадзянін Рэспублікі Беларусь» не толькі эстэтычна аформлены падарунак, але і выдатны універсальны падручнік у дапамогу школьнай праграме па гісторыі, грамадазнаўстве і літаратуры.

Быць грамадзянінам Рэспублікі Беларусь - гэта высокі гонар. Дзе б ні быў беларус - на сваёй зямлі ці далёка за мяжой, ён ганарыцца прыналежнасцю да сваёй краіны.

# Шосты школьны дзень

## 7 сакавіка – творчая майстэрня “Падарунак маме”







# Нашы дасягненні



Республиканское
государственно-общественное объединение
«Белорусское республиканское общество
спасания на водах» (ОСВОД)
МИНСКАЯ ОБЛАСТНАЯ ОРГАНИЗАЦИЯ ОСВОД

ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА

Дзержинской
Президиум
районной организации ОСВОД

НАГРАЖДАЕТ
КОЗЫРЯНА
Константина,

учащегося государственного учреждения образования
«Черниковщинский учебно-педагогический комплекс
детский сад – базовая школа»

Председатель
районной организации ОСВОД

«18» марта 2020 г.

Віншуем Казарана Канстанціна, вучня 5 класа, з перамогай ў адкрытым раённым конкурсе камп'ютэрнага малюнка «Майстар Paint».

Жадаем не спыняцца на дасягнутым, заўсёды рухацца наперад і дасягаць самых высокіх вяршынь!!!



# Аб’ява!!!




Да ўвагі бацькоў і навучэнцаў!

З 30 сакавіка па 4 красавіка ўключна ў школе будзе працаваць школьны аздараўленчы лагер “Вясёлка” з дзённым наведваннем. Вас чакае насычаны і актыўны адпачынак, шматлікія цікавыя справы, спартыўныя мерапрыемствы і вясёлы час з сябрамі!

За падрабязнай інфармацыяй звяртайцеся да класных кіраўнікоў.

Рэдкалегія: вучні 8 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 8 класа.